# КЛАЎС ШТЭК

# НІЧОГА НЕ ВЫРАШАНА.

GOETHE
INSTITUT

Sprache. Kultur. Deutschland.



# КЛАЎС ШТЭК
# НІЧОГА НЕ ВЫРАШАНА.

GOETHE
INSTITUT
Sprache. Kultur. Deutschland.

KLAUS STAECK

# NICHTS IST ERLEDIGT.

GOETHE
INSTITUT

Sprache. Kultur. Deutschland.

# КЛАЎС ШТЭК

# НІЧОГА НЕ ВЫРАШАНА.

# ПРАДМОВА



**НІЧОГА НЕ ВЫРАШАНА.** Назва, якую Клаўс Штэк даў сваёй выставе плакатаў па экалагічнай праблематыцы, нагадвае цяжкі ўздых чалавека, што ў роспачы глядзіць на бязладдзе, ў якім перад ім паўстае свет. І адначасова гэты загаловак гучыць як выклік. Калі мы яшчэ нічога не вырашылі, то у нас ёсць усе прычыны не спыняцца ў навядзенні парадку і працягваць асветніцкую працу. Бо нават калі яшчэ нічога не вырашана, пэўныя дасягненні ўсё ж такі ёсць. Без мастакоў кшталту Клаўса Штэка, якія правакавалі ўжо тады, калі правакацыя яшчэ прыносіла нейкую карысць, Федэратыўная Рэспубліка Германія не была б той дзяржавай, на якую іншыя глядзяць часам са здзіўленнем, а часцей з захапленнем, калі гаворка ідзе пра вызначэнне важнасці экалагічных праблем у палітыцы.

"Нафтавы шэйх" (1982 г.; малюнак на с. 103) стаў сімвалам той навалы, што ахапіла нашу планету ад праліва прынца Уільяма (Аляска) да Мексіканскага заліва і Пратокі Выспаў (Новая Зеландыя) – навалы неабачлівасці, недальнабачнасці, бессаромнасці, прагнасці. Па спіралі нарастання нашы грамадствы перабіваюцца ад рэкламнага тыдня кампаніі Shell да такога ж тыдня кампаніі British Petroleum. Той, хто ўзводзіць эканамічныя прынцыпы ў абсалют, парушае найпрасцейшыя прынцыпы этычна дапушчальнай дзейнасці. Гэта аб'ядноўвае забрудненне навакольнага асяроддзя з фінансавым крызісам, які набыў маштабы ледзь не сусветнага пажару, – яго

ахвярамі вось ужо каторы год становяцца цэлыя нацыянальныя эканомікі.
Клаўс Штэк быў адным з першых, хто ў сваім палітычным мастацтве звярнуў увагу на змяненне клімату. Інстытут імя Гётэ займаецца гэтай тэмай ужо даўно. Таму назва выставы мае, безумоўна, і характар патрабавання, адрасаванага нашай дзейнасці: не адмаўляцца ад намаганняў у тлумачэнні таго, да чаго прыводзіць пацяпленне Зямлі, звяртаць увагу грамадскасці на наступствы пацяплення для развіцця і захавання культур.
Творы Клаўса Штэка з'яўляюцца нязменным складнікам візуальнай памяці цэлага пакалення. У іх іканічная сіла выявы цесна спалучаецца з магчымасцямі разумнага выкарыстання тэксту. У сваёй узаемааднесенасці ў форме іранічнай рэфракцыі або сатырычнай градацыі яны ўтвараюць складанае цэлае, якое не змяншае, а ўзмацняе сілу ўздзеяння кожнага плаката. Як ніякі іншы мастак у Германіі, Клаўс Штэк здолеў паказаць, што палітычнае мастацтва не павінна адмаўляцца ад такой складанасці і што той, хто хоча тварыць мастацтва, усё яшчэ можа быць і палітыкам.

Леангард Эмэрлінг,

загадчык аддзела выяўленчага мастацтва
Інстытута імя Гётэ, Мюнхен



# МАСТАЦТВА СУПРАЦЬ БЕЗАДКАЗНАСЦІ

Крыстаф Танерт

**ВОСЬ УЖО БОЛЬШ ЗА СОРАК ГОД** нямецкі мастак Клаўс Штэк выкарыстоўвае мастацтва як мастацка-палітычную каардынату. У сваіх плакатах і серыях паштовак, а таксама ў пакуль што мала вядомых калажах і фотаздымках мастак імкнецца дапамагчы свайму гледачу зразумець коды нашага часу. Штэк – асветнік, які нават у часы, калі гінуць утопіі і прывычныя арыенціры каштоўнасцей, прытрымліваецца "левых" крытэрыяў мыслення і пры гэтым не закрывае вочы на супярэчнасці і пэўныя неадпаведнасці такога падыходу. З адмаўлення для яго вынікае больш чым адно толькі непрызнанне існага ці абарона мінулага.

Ён вырас у ГДР, але яшчэ да пабудовы Берлінскага мура перайшоў на Захад. Тое, што ў ФРГ яму давядзецца сутыкнуцца з мяшчанствам эры Адэнаўэра, можна было прадбачыць: як член СДПГ – ці, можа, якраз нягледзячы на прыналежнасць да гэтай партыі – ён не быў гатовы прымірыцца з існуючымі парадкамі. Безадказнасць прагных – вось што і сёння яшчэ не дае спакою яго рэвалюцыйнаму духу. Кожны створаны ім плакат, кожная паштоўка інтэрпрэтуе капіталістычную сістэму максімальна проста; такім простым паказам аўтар хоча нагадаць гледачу, што грамадскія парадкі не павінны быць такімі, якія яны ёсць. Таму гэтыя творы і да нашага часу не страцілі сваёй актуальнасці. Апынуўшыся перад творамі Штэка, мы не можам не задаць сабе

пытанне: “А ці магу я паўплываць на тое, што тут адбываецца?”

Мастак свядома працуе над тым, пра што яшчэ ніхто не гаворыць і штó з гэтай прычыны належыць да з’яў другога шэрагу. А заўважаецца яно толькі ў той момант, калі становіцца прадметам мастацкай (рэ)канструкцыі.

Штэк аргументуе з пазіцый маралі, супольнасці і дэмакратыі, з жартам і надзеяй на будучыню. Пры гэтым ён ніколі не прэтэндуе на валоданне нейкай абсалютнай ісцінай.

Ён ведае: ісціна – гэта не стан, а праца, якая, па словах вялікага эпістэмолага Жана Кавэйе, заключаецца ў “няспыннай перапрацоўцы шляхам паглыблення і выкрэслівання”. Ісціна – гэта ўжо не тая далёка схаваная існасць, як падкрэслівае філосаф Бернар-Анры Леві, “з’яўленне якой нам даводзілася б падпільноўваць; яна ёсць эфект позірку, што ўзнікае разам з позіркам і з’яўляецца настолькі ж зменлівым, крохкім, няпэўным і мігатлівым, як і сам позірк”. Інакш кажучы, “чыстай” інфармацыі больш няма, няма ісціны, якая б вынікала са схаванай першапрычыны, а ёсць толькі барацьба слоў і вобразаў, суадносіны моцы паміж сіламі, што намагаюцца прыўлашчыць гэтыя вобразы і словы на ўласнай мове і скарыстацца імі ў сваіх інтарэсах.

Клаўс Штэк ніколі не рабіў таямніцы са сваёй дзейснай прыхільнасці да германскай сацыялдэмакратыі. У знак радыкальнай маральнасці ён арганізоўваў форумы і заклікаў палітыкаў да сумленнасці. Штэк нястомна пракладвае масты ад палітыкі да грамадскасці. І мастацтвам, і палітыкай ён займаецца з агнём у сэрцы. У яго ёсць толькі ўпэўненасць, якая ідзе ад ўласнай сілы перакананння. І павага да тых, хто мае іншыя перакананні.

Выявы Штэка ствараюць з плыткіх сігніфікантаў новыя кантэксты. Яны прымушаюць звінець аскепкі думак. За імі стаяць мары пра ўздым, пра перамены. Штэку давялося пераажыць і тое, і тое; яго рух ажыццяўляўся адпаведна лініі традыцыі Джона Гартфілда, новае ўсведамленне становішча культуры прыйшло пад час супрацоўніцтва з Ёзэфам Бойсам – усур'ёз і з бачаннем будучага. У пабудове і ў графіцы выяў Штэка жывуць дух свабоды і безумоўнасць 70-х гадоў мінулага стагоддзя, якія патрэбны заўтрашняму дню. Утопіі, якія задумвае Штэк, ён і сёння яшчэ ператварае ў дзеянні, а не ў высокія тэорыі. Пры гэтым ён улічвае магчымасць канфрантацыі. Больш за сорак разоў рабіліся спробы забараніць выпуск яго плакатаў і паштовак, але запалохаць Штэка – адваката і баламута "са стажам" – не ўдалося. Як сведка свайго часу ён увасабляе тое, што бачыць і робіць. І хаця ён заўсёды жыве па-над узроўнем сваіх сіл, ён ніколі не робіць

уражання чалавека знясіленага – можа хіба толькі мае трохі меланхалічны выгляд.

У творах Штэка выявы сродкаў мас-медыя, лагатыпаў, паняццяў і імёнаў ўспрымаюцца як сведчанні канкрэтнага духу часу, яны ператвараюцца ў інтэрпрэтацыю гэтага духу самім Штэкам. Штэк любіць сілкаваць свой візуальны механізм ідэй няспраўджанымі рэкламнымі абяцаннямі. Рэклама ніколі не выконвае таго, што абяцае. Прыдумалі яе не для гэтага. У Штэка ёсць невычэрпнае поле працы. Яно ахоплівае такія сферы як палітыка, эканоміка, экалогія, культура, нямецкія і ўвогуле еўрапейскія сродкі масавай інфармацыі; пры гэтым асабліва значэнне надаецца характэрным прыкметам капіталізму апошняга часу, функцыі фетышу, уласцівай лагатыпам, культурнаму досведу у спалучэнні з пэўным стылем жыцця і шматлікім з'явам, якія маюць дачыненне да абуджэння і пералому на Усходзе і Захадзе пасля 1990 года.

Ілюстрацыі ў гэтым выданні прысвечаны галоўным чынам разнастайнай экалагічнай праблематыцы. Пры гэтым для Клаўса Штэка важна не столькі стварыць адчуванне заспакоенасці ад сумленнага стаўлення да навакольнага асяроддзя, колькі даць імпульсы для роздуму пра жыццё з усведамленнем уласнай адказнасці, каб актыўна папраўляць сапсаваныя стасункі паміж чалавекам і прыродай. Амаль

усе плакаты Штэка былі створаны больш за трыццаць гадоў таму назад. А ў наш час абарона навакольнага асяроддзя ўжо не з'яўляецца справай толькі спецыялістаў з такіх арганізацый, як Грынпіс. Усё больш і больш людзей разумеюць, што яны залежаць ад навакольнага свету.

Зместам твораў Штэка з'яўляецца ядзернае атручванне нашай планеты, пацяпленне клімату, забруджванне паветра, вод, сродкаў харчавання. Акрамя таго, аўтар накіроўвае свае стрэлы на аўтамабільную прамысловасць і праектаванне ў галіне транспарту. Хаця Штэк мае на ўвазе ўладу капітала, ён, аднак, не ідэолаг. Але ён прыводзіць аргументы супраць рынкавага радыкалізму. Індустрыяльныя дзяржавы Захаду мастак абвінавачвае ў тым, што яны занадта шмат прыроднай жыццёвай прасторы ахвяравалі развіццю эканомікі. Ён хоча змяніць свядомасць, стымуляваць актыўны асабісты ўнёсак кожнага чалавека. Ці можа здзейсніць гэта яго мастацтва?

Прынамсі, яно дастаткова выбуховае, каб прывесці ў рух новае мысленне.

Многія з матываў Штэка суадносяцца з вядомымі творамі еўрапейскага выяўленчага мастацтва – такімі, напрыклад, як "Вялікі кавалак луга" Альбрэхта Дзюрэра (1503 г.)[1], аўтапартрэт Каспара Давіда Фрыдрыха "Падарожнік над морам туману" (1818 г.)[2],

"Гётэ ў Кампаны" Генрыха Вільгельма Тышбайна (1787 г.)[3], а таксама "Снеданне на траве" Эдуара Манэ (1863 г.)[4]. І паколькі многія немцы, як і раней, захапляюцца нашымі айчыннымі лясамі, якія яны бачаць жывым цэлым, дзе пульсуюць прадуктыўныя сілы і ёсць душа, то і Штэк выкарыстоўвае агульнае прыязнае стаўленне да лесу, каб задаць свае пытанні. Для пацверджання таго, якую папулярнасць мае выява аленя, які рыкае на палянцы ў чыстым лесе і на маляўнічым фоне гор, можна прывесці шматлікія акадэмічныя прыклады[5] з канца XIX стагоддзя і пазнейшага часу. Аб'ектамі для Штэка становяцца ў аднолькавай ступені і тыя, хто апявае лес, і тыя, хто яго знішчае. Ніхто не можа адчуваць сябе ў бяспецы. Абодва лагеры – як аднаўленчыя сілы, так і тыя, хто не ўсведамляе неразумнасць сваіх учынкаў, – аднолькава трапляюць пад яго канцэптуальныя стрэлы.

Творы Штэка набываюць вастрыню стралы там, дзе мастак настойліва распаўсюджвае эйфарыю імкнення. Яны ясна прымушаюць сітуацыю змяніцца і адлюстроўваюць актуальныя грамадскія працэсы. Свет з цытат і праекцый стварае выдатны эфект бязраднасці, таму што атрыманая намі ад продкаў надзейнасць з кожным днём усё больш раскрышваецца, пачынаючы са сваёй перыферыі.

**1** Клаўс Штэк выкарыстаў гэты твор у сваім "Вялікім кавалку луга" (с. 23)

**2** Матыў выкарыстаны ў творы "Выходзь на адкрыты прастор, дружа" (с. 49)

**3** Свайму твору Клаўс Штэк даў назву "225-я гадавіна Гётэ" (с. 82–83)

**4** "Назад да прыроды" – так акрэслівае праблематыку Клаўс Штэк, і для сваёй крытыкі ўсеагульнага неразумнага стаўлення да прыроды ён знаходзіць саюзніка ў асобе Манэ (с. 106–107)

**5** Варта нагадаць, напрыклад, пра захапленне радзімай ў творах акадэмікаў Хрысціяна Кронера, Гвіда фон Мафэя і Морыца Мюлера. Але і ў асяроддзі нямецкіх аматараў, а таксама на блышыных кірмашах матыў аленя па-ранейшаму з'яўляецца фаварытам.

**КРЫСТАФ ТАНЕРТ** (нарадзіўся ў 1955 годзе) вывучаў археалогію і мастацтвазнаўства ва ўніверсітэце імя Гумбальдта (Берлін). Затым, да 1990 года, працаваў у галіне мастацкай крытыкі, публіцыстыкі і арганізацыі выстаў у Берліне і краінах Усходняй Еўропы. Ён займаўся таксама гуказапісам і выпускам кніг пра мастакоў у выдавецтве ўзаемадапамогі URSUS PRESS. У 1991 годзе Танерт атрымаў пасаду кіраўніка праектаў Дома мастакоў Betanien ў Берліне. З 2000 г. ён з'яўляецца таксама і яго менеджарам. Адначасова ён быў адным з выдаўцоў мастацкага штогодніка часопіса BE-Magazin, апублікаваў шматлікія кнігі і артыкулы аб сучасным мастацтве, у тым ліку ў якасці ўкладальніка выдаў зборнік матэрыялаў пра сучасны нямецкі жывапіс "New German Painting" (2006 г.).


ПЛАКАТЫ
КЛАЎС ШТЭК


Picasso
Kantor
Ulrichs
Kaprow
Duchamp
Darboven
Sarkis
Buren
Haacke
Sieverdin
Broodthaers
Paik
Beuys
Polke
Hamilton
Goya
Heartfield
Klee
Daumier
Matta
Gue
Lohse

# VORSICH




# T KUNST!

мал. на с. 16–17

Асцярожна! Мастацтва!
1982

Працягвае павышацца.
1995

(41,2°C. ПРАЦЯГВАЕ ПАВЫШАЦЦА)


41,2 °C
TENDENZ STEIGEND

Аб'ект арэнды.
1983

(З АБ'ЕКТАМ  АРЭНДЫ ВЫ ПАВІННЫ
АБЫХОДЗІЦЦА АШЧАДНА І ЗДАВАЦЬ
ЯГО Ў ДОБРЫМ СТАНЕ)



# Die Mietsache ist schonend zu behandeln und in gutem Zustand zurückzugeben

Вялікі кавалак луга.
1987

(АЛЬБРЭХТ ДЗЮРЭР. ВЯЛІКІ ГАЗОН.
1503 г./ 1987 г.)

# Albrecht Dürer: Das grosse Rasenstück 1503/1987



Атрута наша надзённая.
1985

(АТРУТЫ НАШАЙ НАДЗЁННАЙ
ДАЙ НАМ СЁННЯ)

# Unser täglich Gift gib uns heute



І Зямлю сабе падпарадкуйце.
1987

# UND MACHT EUCH DIE ERDE UNTERTAN



Аляскінскія сардзіны ў алеі.
1989


Esso
Alaska
Öl-
Sardinen
SAE 15W-40
1 Liter

Нямецкі змяшаны лес.
1984

(дажджаўстойлівы)

# Deutscher Mischwald (regenfest)



Кансультацыі для тых, хто трапіў у корак.
1991

(ГЭТАЯ МАДЭЛЬ АСАБЛІВА АПРАЎДВАЕ СЯБЕ Ў КОРКАХ)




# DIESES MODELL MACHT SICH IM STAU BESONDERS GUT.

Дамова паміж пакаленнямі.
1995

(КАБ НАШЫ НАШЧАДКІ ПАМЯТАЛІ НАС
І ПРАЗ 10.000 ГОД)


Damit unsere Enkel noch in
10 000 Jahren an uns denken

Праблема цаны.
2000

(ПРАБЛЕМА ЦАНЫ.
ПРАЗ КОЛЬКІ МІЛЬЁНАЎ ГОД
ЗНОЎ "АДРАСЦЕ" НАФТА?)

# PREISFRAGE

## In wieviel Millionen Jahren wächst Erdöl nach ?



І новае жыццё ў руінах расцвітае.
1979



UND NEUES LEBEN BLÜHT AUS DEN RUINEN

Будучыня належыць аўтамабілю.
1984

(БУДУЧЫНЯ НАЛЕЖЫЦЬ АЎТАМАБІЛЮ.
Сумесная рэклама еўрапейскай
аўтамабільнай праымысловасці)

# Die Zukunft gehört dem Auto

Eine Gemeinschaftswerbung der europäischen Automobilindustrie



Эканамічны рэгіён: Германія.
1996


STANDORT DEUTSCHLAND

Урад сусвету.
1981

(На ўспамін пра дзень
прынясення прысягі
новым урадам сусвету)




Zur Erinnerung an die Vereidigung der neuen Weltregierung

Без марнатраўства няма свабоды.
1979

# Keine Freiheit ohne Verschwendung



Выходзь на адкрыты прастор, дружа.
1991


KOMM INS OFFENE, FREUND

Прысвячаецца Дню маці.
1971



Гамбург(ер)скія канцэрны.
1989

(Тут мы пераўтвараем бескарысныя
трапічныя лясы ў каштоўныя выпасы.
Гамбург(ер)скія канцэрны – партнёры
Трэцяга свету)


Hier wird nutzloser Regenwald in kostbares Weideland verwandelt
Hamburger Konzerne
Partner für die Dritte Welt

Шкоднік лясоў.
1984

(ЧАЛАВЕК
~~КАРАЕД~~ – НАЙГОРШЫ ШКОДНІК ЛЯСОЎ)

Mensch

# Der ~~Borken~~käfer ist der größte Forstschädling



Ура! Мы жывём!
1984

(Глеба памірае. Вада памірае.
Паветра памірае. Лес памірае.
Жывёлы паміраюць.
УРА! МЫ ЖЫВЁМ!)

Der Boden stirbt
Das Wasser stirbt
Die Luft stirbt
Der Wald stirbt
Die Tiere sterben

# HURRA WIR LEBEN



# БЕЗ МАРНАТРАЎСТВА НЯМА СВАБОДЫ

Гаральд Вельцэр

"Эпохай росту будуць цешыцца і захапляцца – аж да таго часу, пакуль не высветліцца, што рост даўно ўжо выйшаў за дапушчальныя межы (мы ведаем гэта, бо так ужо адбылося). На вялікае здзіўленне ўсім вельмі хутка эпоха росту закончыцца крахам. А калі крах яшчэ на некалькі гадоў удасца стрымаць, то будзе ўсё больш зразумела, што чакаць калапс давядзецца нядоўга. Пасля яшчэ даўжэйшага перыяду спаду наўрад ці ў каго яшчэ захаваецца вера, што і ён калісьці скончыцца. Толькі адзінкі будуць яшчэ спадзявацца, што некалі вось настане час – і зноў будзе дастаткова энергіі і рыбы"[1]

**БЕЗ МАРНАТРАЎСТВА НЯМА СВАБОДЫ** – гэты неабвержны лозунг, размешчаны над самалётам, што на фоне заходзячага сонца ўзлятае над "шэўрале камара" са шчаслівай парачкай, дае праўдзівую інфармацыю пра тое метафізічнае месца, якое заняла наша эканамічная сістэма і наша пануючая спажывецкая культура (гл. малюнак на с. 47). Толькі дзякуючы марнатраўству можна пераканацца ў тым, што ты – гэта ты, толькі ў спажыванні

без усялякага сэнсу яшчэ бачыцца пробліск свабоды. Яшчэ Барбара Кругер, творчасць якой паводле зместу цалкам роднасная творчасці Клаўса Штэка, трансфармавала афарызм Дэкарта „Cogito ergo sum“ ("Я мыслю – значыць, існую") у больш адпаведнае нашаму часу „I shop therefore I am" ("Я купляю – значыць, існую"), але з таго часу прайшло не адно дзесяцігоддзе. Тут зноў бачна, наколькі мастацтва апераджае ўсё астатняе – напрыклад, эканаміку як навуку або сацыялогію. У той час калі эканамічныя навукі з вялікім спазненнем і толькі ў асобе сваіх аўтсайдэраў прынялі да ведама, што экалагічны кошт нашага ладу жыцця і гаспадарання бязмерна высокі, што, аднак, не ўлічваецца ў цэнах на тавары, сацыёлагі ў сваіх даследаваннях амаль не заўважалі пануючай культуры марнатраўства, якая стала прычынай змянення клімату, вымірання відаў, недахопу вады, дэградацыі глебы і г.д. У гэтых навуках назіраецца занадта дэманстратыўнае ігнараванне таго, уласна кажучы, трывіяльнага факта, якому нельга не здзівіцца, што і чалавек існуе ў сістэме абмену рэчываў з прыродай.

Таму, з аднаго боку, прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі, і, з іншага боку, мастацтва мусілі заняцца сацыяльна-эканамічным феноменам разбурэння навакольнага асяроддзя, якое імкліва паскараецца, а таксама культуры спажывання і марнатраўства, якая пранікае ва ўсе сферы быцця і свядомасці.

На гэтым фоне ўжо выклікае здзіўленне, а з сацыялагічнай перспектывы і пачуццё сораму тая паслядоўная упартасць, з якой мастакі – назавем хаця б таго ж  Клаўса Штэка – не толькі звяртаюцца да тэмы знішчэння ўмоў будучага выжывання індывідаў і грамадстваў, але і паказваюць, хто ў гэтым вінаваты: менавіта мы самі, тыя, хто пад свабодай на самай справе разумее свабоду марнатраўства.

## ЗАБРУДЖАНАЯ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ

Атамная катастрофа ў Японіі, якая пачалася ў сакавіку 2011 года і канца якой пакуль што не бачна, толькі на непрацяглы час аказала радыяцыйны ўплыў на нашу ўпэўненасць у тым, што мы жывём у найлепшым свеце, які толькі можна ўявіць, – у свеце няспыннага прагрэсу, вызваленым ад няўхільнасці законаў прыроды, а тым самым і ад непазбежнасці канца. Той факт, што пэўная краіна, амаль цалкам пазбаўленая сыравінных рэсурсаў, можа займаць трэцяе месца ў свеце па ўзроўні эканамічнага развіцця, нам даўно ўжо не здаецца абсурдам – гэта для нас нешта само сабою зразумелае. Марай новага часу было поўнае вызваленне ад прыроды. Але гэтак сама, як у 2010 годзе аварыя на нафтабуравой платформе Deepwater Horizon кампаніі British Petroleum прынесла не падлічаную дагэтуль шкоду экалагічнай сістэме Мексіканскага

заліва, так і ў 2011 годзе дылетанты з японскай кампаніі Терсо, якой належыць атамная электрастанцыя, на доўгі час забрудзілі частку свету радыяцыяй.

У XIX стагоддзі пераўтварэнне свету бачылася як бясконцы рост прадукцыйнасці. XX стагоддзе аказалася эпохай бясконцага росту марнатраўства. А XXI стагоддзе будзе вызначацца тым, што на шляху чалавецтва паўстане бар'ер – кошт яго мары пра вызваленасць ад прыроды. Стрэс ад канкурэнцыі за валоданне рэсурсамі, фінансавы калапс, геапалітычныя зрухі і экалагічныя катастрофы бясконца нарастаюць, таму тыя, хто сёння знаходзіцца ў дзіцячым ці юнацкім узросце, скіруюць свой пошук найперш на рэсурс, які яшчэ ў XX стагоддзі здаваўся невычэрпным, – рэсурс па імені будучыня. Хаця на першы погляд сітуацыя ў Лондане, Тэль-Авіве, Мадрыдзе або Афінах выглядае не аднолькавай, сутнасць паўсюль тая самая – пратэст супраць выкрадання будучыні.

У гэтым пошуку з мэтай вяртання здольнасці да будучыні сучасныя эліты наўрад ці могуць дапамагчы. Наадварот – яны падпарадкоўваюць свае дзеянні радыкальнаму дыктату сучаснасці. Тэмпы росту германскай эканомікі на радасць менеджарам і палітыкам дасягнулі непрадбачанага ўзроўню, адпаведна вырасла і дзяржаўная запазычанасць, а

таксама колькасць спажытай энергіі. Тое ж можна сказаць і пра рост выкідаў шкодных рэчываў па ўсім свеце. Імкліва павялічваецца пераспажыванне тых рэсурсаў, якія чалавецтву патрабуюцца насамрэч для выжывання, – зямлі, вады (напрыклад, марской), а палітыкі і эканамісты здольныя прыдумаць толькі адно: як і раней, яны бачаць мэту ў росце і імкнуцца любым коштам захаваць выбраны накірунак. Кіраўнік кампаніі Mercedes Дзітэр Цэтчэ, накіроўваючы свой палымяны позірк на рынкі збыту краін, якія хутка развіваюцца, трызніць, што "вялікая эпоха аўтамабіля" толькі пачынаецца. Дарадцы ў сферы аўтамабільнай прамысловасці бачаць у сваіх галюцынацыях, што аб'ём збыту аўтамабіляў па ўсім свеце да сярэдзіны стагоддзя падвоіцца – быццам нічога не чулі пра вуглекіслы газ, цэны на энерганосьбіты і канкурэнцыю за рэсурсы. У часопісе „ADAC-Motorwelt" (нумар за верасень 2010 года) Петэр Фозер, галоўны выканаўчы дырэктар кампаніі Royal Dutch Shell, піша пра будучыню мабільнасці наступнае: "Больш людзей, больш аўтамашын і больш дабрабыту – гэта спрыяе росту попыту на энерганосьбіты. Толькі да 2050 года ў сусветным маштабе ён можа падвоіцца!" Такое прадбачанне для старшыні нафтавага канцэрна – не негатыўная ўтопія, а радасная перспектыва; як і раней, гарызонт яго ўяўлення і на наступныя чатыры дзесяцігоддзі абмяжоўваецца светам сённяшняга дня, нягледзячы

на праблемы з нафтай, глабальнае пацяпленне, канфлікты вакол рэсурсаў, дзяржаўную запазычанасць. Яго ўтопія – гэта непарушная вера ў прагрэс, якая незаўважна даходзіць да абсурду: "Мы ўбачым большую дыверсіфікацыю рухавікоў, відаў паліва і крыніц энергіі. Пры гэтым канструкцыя аўтамабіляў і тэхналогія іх вытворчасці ва ўсё большай ступені будуць вызначацца іх прызначэннем: тыя аўтамабілі, якія павінны выкарыстоўвацца ў гарадскім руху і для пераездаў на невялікія адлегласці, будуць усё больш гібрыдызавацца і электрыфікавацца, а ў сельскай мясцовасці і для далёкіх пераездаў па-ранейшаму будуць у першую чаргу выкарыстоўвацца аўтамабілі на дызельным паліве. Новая і найноўшая мадэль машын, якія набудзе аўтамабіліст, не будуць мець прынцыповых тэхналагічных адрозненняў ад сённяшніх. Калі мы хочам дасягнуць поспеху ў пытанні захавання клімату на бліжэйшую ці сярэднюю перспектыву, то зрабіць гэта магчыма толькі пры выкарыстанні матора ўнутраннага згарання".

## АБМЕЖАВАННІ ЛЮБОГА КШТАЛТУ

Толькі матор унутраннага згарання выратуе клімат – гэтыя словы зноў вяртаюць нас да Клаўса Штэка. Прадметам яго плакатнага мастацтва з'яўляюцца менавіта такія выказванні і дзіўна несумяшчальныя выявы.

"Нямецкія рабочыя! СДПГ хоча адабраць у вас вашы загарадныя дамы ў Тэсіне" (надпіс на малюнку на с. 65) – гэты самы славуты з плакатаў Штэка не толькі мог надоўга збянтэжыць выбаршчыкаў усіх партый. Ён яшчэ і з'явіўся ў 1972 годзе – тым самым годзе, калі былі апублікаваныя славутыя „Limiths to Growth" ("Межы росту") Рымскага клуба. Давайце параўнаем эфект гэтай кнігі – яна з'яўляецца, напэўна, найменш чытанай з усіх кніг за апошнія сорак гадоў – з эфектам плакатаў Штэка. Інфармацыя, якую мы атрымліваем з "Меж росту", зводзіцца галоўным чынам да таго, што, як здаецца, сказана ў загалоўку: калі выкарыстоўваюцца вычарпальныя рэсурсы, то яны некалі канчаюцца. Гэты трывіяльны тэзіс, безумоўна, не хавае ў сабе пагрозы, якая б магла стаць нагодай для нечага больш значнага, чым пустая балбатня на вечарынцы: "Так-так, рыбалоўства прыводзіць да таго, што рыбы ў моры ўсё меншае". – "Так-так. А драпежнае абыходжанне з прыродай! Дастаткова згадаць пра выміранне відаў". Праўда, у кнізе, якая ў арыгінале не выпадкова мае назву "Межы для



Нямецкія рабочыя. 1972 г.

росту", а не "Межы росту", прыводзіцца зусім іншая аргументацыя: даюцца сцэнарыі павелічэння квот выкарыстання прыродных рэсурсаў, з аднаго боку, і абумоўленых гэтым аб'ёмаў выкіду шкодных рэчываў, з другога; робіцца выснова, што паскарэнне параспажывання рэсурсаў адбываецца экспаненцыяльна. Гэта прыводзіць да таго, што некалі будзе дасягнуты пункт, пачынаючы з якога празмернае выкарыстанне немачыма будзе спыніць. Гэта той момант, які даследчыкі клімату называюць "tipping point": з яго пачынаюцца нелінейнае развіццё і ўзаемадзеянне, калі ніводзін чалавек ужо не ведае, што будзе далей. Эканаміст Дэніс Мідаўз і яго паплечнікі мелі, на жаль, рацыю: з 1972 года эксплуатацыя сыравінных рэсурсаў адбываецца менавіта так, як яны прадказвалі, тое ж можна сказаць і пра прычыненне непапраўнай шкоды. Бяда ў тым, што выкарыстанне рэсурсаў, а разам з ім і рэзкі выхад за крытычную мяжу адбываюцца экспаненцыяльна. З таго боку гэтай мяжы ніхто больш не зможа вярнуцца, як у настольнай гульні Monopoly, на поле "старт".

Але размовы пра катастрофу, якія вядуцца з таго часу ("Гадзіннік паказвае без пяці дванаццаць!"), сталі з улікам поспехаў Грынпіса, Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF), Асацыяцыі грамадзян за падаткаабкладанне фінансавых аперацый (Attac) і г.д. настолькі будзённай справай, што нават

надзвычай драматычныя сведчанні раставання леднікоў не выклікаюць ужо ніякай заклапочанасці. Такія паведамленні закранаюць толькі паверхню свядомасці спажыўца інфармацыйных перадач – гэтаксама, як і паведамленні пра штодзённыя тэрарыстычныя акты ў Афганістане, Пакістане ці Іраку. А прадметам устойлівай камунікацыі не павінна быць вось такое: мы мусім змяніцца, каб усё заставалася такім, якое ёсць. Такі заклік не мае ніякага эфекту, таму што ўсё і так ужо ёсць такое, якое ёсць, і без таго, каб мы змяняліся. Асветніцкія высілкі такога кшталту пазбаўлены духу – але галоўнае: яны пазбаўлены будучыні.

У процілегласць гэтаму парадаксальныя плакаты Штэка ствараюцца на фоне будучыні, якую трэба выйграць, выйграць у барацьбе з зацікаўленасцю толькі ў сённяшнім дні, характэрнай для нафтавага канцэрна British Petroleum, Deutsche Bank, кампаніі Mercedes Benz і іншых суб'ектаў гаспадарання, якія, не клапоцячыся ні пра якія наступствы, умацоўваюць дыктатуру сучаснасці. "А што мне за справа да свету нашчадкаў?" – так заявіў аднойчы комік Граўчо Маркс. "Ці ж тыя нашчадкі калі-небудзь клапаціліся пра мяне?" "Такой жменьцы смецця мы здолеем даць рады" – так гучыць лозунг сучаснасці ў плакаце Клаўса Штэка (1985 г.; малюнак на с. 85). Парадаксальная камунікацыя – калі яна пабудавана правільна – прыводзіць у рух

аперацыю аўта-мыслення: не паўтарэнне гатовага аргумента, а выпрацоўка думкі ў працэсе агляду. І толькі тыя думкі, якія выпрацаваны табою самім, маюць дзейсны эфект. Сюды належыць і творчае разбурэнне чаканага сэнсу. Напрыклад, група мастакоў Yes Men у 2008 годзе прапанавала ў кіёсках асобнікі газеты "Нью Ёрк Таймс" – дакладную копію арыгіналу, але толькі са станоўчымі навінамі, або група рэжысёраў Rimini Protokoll у 2009 годзе трансфармавала сход акцыянераў у тэатральны спектакль – гэта выклікае такую ж збянтэжанасць, якую спрычыняе Клаўс Штэк сваімі плакатамі і прымушае задаць пакуль што вельмі недаацэненае пытанне: "Для чаго ўсё гэта?".

Самы лепшы прыклад парадаксальнай камунікацыі даў вялікі Макс Эрнст. Калі ён упершыню атрымаў шмат грошай, то вырашыў праехацца па вуліцах берлінскага раёна Кройцберг на "ролс-ройсе". Апусціўшы шыбу, ён крычаў з машыны: "Далоў пралетарыят!" Калі яго запыталіся, навошта ён так крычаў, Эрнст адказаў: "Я быў проста вінны гэта тым людзям!"

## У ЧЫМ НАШ АБАВЯЗАК

Мы бачым: у тым, што тычыцца будучыні, мастакі больш кампетэнтныя, чым прадстаўнікі іншых сфер сучаснага жыцця. Эстэтычныя метады пазнання не

падпарадкоўваюцца ні прымусу доказаў навукі, ні чаканню рэндытаў трымальнікамі акцый. Яны ствараюць узаемасувязі – дык кім мы, творцы эры дурняў[2], застанемся ў памяці будучых пакаленняў ("Дамова паміж пакаленнямі", 1995 г.; малюнак на с. 35)? Яны пераходзяць межы рэальнасці і дазваляюць сабе, не маючы напагатове адказаў, мець мноства пытанняў. Напрыклад: як будзе выглядаць калапс сучаснага грамадства? Так, як у адным з фільмаў Роланда Эмерыха, ці ўсё ж хутчэй як паступовы пераход са стану адноснай стабільнасці ў стан вяла цякучай эрозіі перадумоў, на якіх грунтуецца грамадства? Колькі фіктыўных пяцігадовых планаў напрыдумваў Савецкі Саюз, перш чым разваліцца, сыйшоўшы на нішто мізэрным пшыкам? Колькі тавараў, выпушчаных у ГДР, заставалася на складах, бо для іх не знаходзілася рынкаў збыту, перш чым без ніякага грукату абрынуўся Берлінскі мур? Вось так, з вялікім ці малазначным крахам сэнсу, які ўвесь час памяншаецца, і надыходзіць калапс. І дакладна такія самыя прыклады вялікага ці малазначнага краху ўзнікаюць на плакатах Штэка – здавалася б, асобнымі блукаючымі агеньчыкамі, але з упартасцю стоікаў, якую неабходна супрацьпаставіць кумулятыўна наўмыснай, пазбаўленай сэнсу рэальнай палітыцы і фікцыйнай эканоміцы, калі хочаш нешта змяніць. А гэта наш абавязак перад самімі сабою.

## ПАД КАНЕЦ СІМУЛЯЦЫІ

Зараз сімуляваная нармальнасць набліжаецца да свайго канца. Апакаліптычная слепата ва ўсіх яе варыянтах – ад неалібералізма да скептыцызма ў стаўленні да клімату і да геаінжынірынга – вядзе да смерці. Чаго ніводзін з пералічаных варыянтаў не мае, дык гэта маральнай фантазіі (паводле філосафа Гюнтэра Андэрса), якая дала б магчымасць уявіць сабе, што адбудзецца "пасля гэтага". Вызначэнне патэнцыялу да катастрофы – перадумова будучага выжывання. Таму важна адмовіцца ад дзіцячай веры, што зараз у нас нібыта ўсё ідзе як след, таму што заўсёды ўсё ішло як след. Тыя разумнікі, на думку якіх з факта "свет пакуль яшчэ не загінуў" можна зрабіць выснову, што ён менавіта з гэтай прычыны і не можа загінуць, займаюцца антыасветніцкай дзейнасцю і служаць інтарэсам тых, якім будучыня ані не абыходзіць, бо яны маюць на гэта свае важкія прычыны.

Распаўсюджаная думка, быццам мы, старанна раздзяляючы смецце, ужо робім нешта значнае для выратавання планеты, абараняе ад усведамлення, у прыватнасці, таго факта, што вынікам развіцця нашай спажывецкай культуры стала, напрыклад, павелічэнне колькасці купленай мэблі ў паўтара разы за кожныя дзесяць год. Справа ў тым, што такія прадметы доўгатэрміновага карыстання, як мэбля,

сталі кароткавечнымі моднымі рэчамі. Менавіта ў выніку ІКЕАзацыі асяроддзя нашага жыцця спажыванне матэрыялаў і колькасць смецця ўвесь час павялічваецца. Сёння жыхары ЗША каля 40 % агульнай колькасці прадуктаў харчавання ўжо не спажываюць, а купляюць і выкідваюць, у Еўропе адпаведна 30 %. Рост аб'ёмаў выкінутага ёсць простым ператварэннем рэсурсаў у адыходы.

Зараз ужо нават выпускаюцца машыны для вытворчасці адыходаў. Адна з іх мае назву Нэспрэса (Nespresso). Спачатку "на рынку" усталёўваецца абсурдная стратэгія: на кожны кубачак кавы рэалізаваць і капсулу, выраб якой каштуе шмат часу і працы, і тым самым забяспечыць неймаверна высокую цану прадукта і стварыць яшчэ больш значны фактар вытворчасці смецця ў дадатак да прадукта. Сітуацыя можа мець  наступнае лагічнае развіццё: нехта – напрыклад, адзін з былых кіраўнікоў фірмы "Нэспрэса" – скеміць, што з экалагічнага пункту гледжання  гэта натуральнае свінства, і пачне выпускаць экалагічна чыстыя капсулы  для машын, у якіх гатуецца кава ў такіх капсулах. Р-раз – і высакародную характарыстыку "экалагічна чысты" набывае тавар, які зусім нядаўна ўвогуле яшчэ не існаваў і які насамрэч мог быць экалагічна чыстым толькі таму, што яго яшчэ не было. Такія вось справы з ростам: ён, як гэта ні парадаксальна, набывае тым большую важнасць, чым большага прагрэсу дасягае матэрыяльнае

насычэнне і чым лепш задавальняюцца жыццёвыя патрэбы. У гэтым заключаецца ўнутраная бязмежнасць грамадстваў, арыентаваных на рост, і тых, хто да гэтых грамадстваў належыць. Яны толькі тады дасягнуць канца, калі ўжо не застанецца нічога, што можна было б спажываць, калі ўсе рэсурсы будуць вычарпаныя.

А вучоныя-эколагі нястомна вылічваюць carbon footprints прадуктаў – укладзеную ў іх вытворчасць энергію. Яны прыводзяць у лічбах колькасць гекталітраў "віртуальнай вады", якая ўтрымліваецца ў каве, чаю, біфштэксах і г.д., падрахоўваюць вагу "экалагічных рукзакоў" з расходавання земляў, з экалагічнай шкоды і г.д. На жаль, пры гэтым цалкам па-за іх увагай застаецца той факт, што ўсе гэтыя выдаткі ідуць ва ўсё большай ступені на вытворчасць тавараў, якія вельмі хутка ператвараюцца ў смецце і адыходы, таму што тэрмін іх спажывання рэзка скарачаецца – ці таму, што яны проста адразу ж выкідваюцца. Эканаміст Ніка Пэч у сваіх работах дакладна даказвае, што аддзяленне спажывання рэсурсаў ад эканамічнага росту – наіўная мара. Рост не можа быць пазбаўлены матэрыяльнасці, больш таго – эканоміка росту функцыянуе толькі тады, калі людзі імкнуцца мець усё больш і больш новых рэчаў, нягледзячы на тое, што іх жыццёвыя патрэбы ў харчаванні, адзенні, жыллі даўно задаволены. Той аргумент, што, маўляў, рост патрэбны, каб дасягнуць

дабрабыту і захаваць яго, пазбаўлены ўсякай логікі, бо нішто не з'яўляецца большым ворагам эканомікі росту, чым дасягненне і забяспечанне дастатковага ўзроўню дабрабыту. Але ж не, трэба яшчэ больш, трэба перасягнуць гэты ўзровень, і таму крыніцы энергіі і іншыя рэсурсы ўсё больш ідуць на вытворчаць рэчаў, якія ўжо ператварыліся з прадметаў спажывання ў чыстыя прадметы набыцця.

У сапраўднасці ж індустрыяльная сучаснасць характарызуецца тымі экспансіўнымі стратэгіямі, якія Клаўс Штэк нястомна выбірае ў якасці сваіх тэм. І ўсё роўна, возьмем мы "Аляскінскія сардзіны" (1989 г.; малюнак на с. 29) ці "Пытанне цаны: праз колькі гадоў «адрасце» нафта" (2000 г.; малюнак на с. 37), – мы пераканаемся, што дыктатура сыравінных інтарэсаў сучаснасці над імкненнем будучых людзей да выжывання з'яўляецца галоўнай тэмай Штэка. Дарэчы, адказ на пытанне цаны даў Ён Шэльнгубер, дырэктар Патсдамскага Інстытута даследаванняў клімату, у інтэрв'ю часопісу "Шпігель": пяць мільёнаў год спатрэбіліся Зямлі для вытворчасці той колькасці выкапнёвай сыравіны, якую мы спальваем за адзін год. Але даволі марудная зямная сістэма з'яўляецца антытэзай эканамічнай сістэме, для якой сучаснасць – гэта ўсяго толькі перавалачны пункт на шляху да Свету, які нарыхтаваў нам яшчэ больш усяго. У адказ на змяншэнне аб'ёмаў здабычы нафты робяцца ўсё больш глыбокія свідравіны; у адказ

на змяншэнне запасаў вады абяссольваюць мора; у адказ на змяншэнне колькасці рыбы рыбалоўныя караблі выходзяць у мора ўсё далей. Менавіта выкарыстанню экстэнсіўных стратэгій – гэта значыць, пастаяннаму павышэнню прадуктыўнасці і росту спажывання – жыхары індустрыяльных краін абавязаны бяспрыкладным у гісторыі багаццем, сярэдняй працягласцю жыцця, узроўнем адукацыі, а таксама бяспекай. Праблемай застаецца толькі тое, як пераканаўча паказаў у сваёй кнізе "Калапс" („Kollaps") універсальны вучоны Джэрад Дайамонд, што, выкарыстоўваючы стратэгіі, якія на працягу доўгага часу прыносілі поспех, грамадствы руйнуюцца менавіта тады, калі апынаюцца ў стрэсавай сітуацыі. Калі, такім чынам, у час знікнення рэсурсаў павялічваецца распрацоўка карысных выкапняў ці ў час пацяплення клімату павялічваецца аб'ём выкідаў вуглекіслага газу, гэта толькі паскарае рух да гібелі. Адзіны заклад, у які ідуць пры гэтым разумнікі гэтага свету накшталт Фозеры (гл. с 9), гэта заклад наконт іх уласнай будучыні: прынамсі, на час іх жыцця таго, што можа даць наша планета, напэўна, яшчэ хопіць.

Наш свет нейкім жудасным чынам зрабіўся менавіта такой супрацьлегласцю ўтопіі, якім Клаўс Штэк распрацоўваў яго ў сваіх плакатах на працягу дзесяцігоддзяў. Тая мадэль эканомікі і грамадства, якая прапаноўвае бясконцае нарастанне

шчасця праз бясконцае пашырэнне зоны спажывання, мае настолькі моцны эфект засмоктвання, што наўрад ці хто можа супрацьстаяць яму. Форма арганізацыі эканомікі, функцыянаванне якой заключаецца ў няспынным росце, настолькі ж не здольна адмовіцца ад рэгулярных павышэнняў дозы, як і наркаман, арганізм якога ўвесь час патрабуе яшчэ большых колькасцей наркатычнага рэчыва. Яго прага ва ўсіх адносінах – фінансавых, сацыяльных, медыцынскіх – у вышэйшай ступені шкодная, і яна, з аднаго боку, дае яму кароткачасовае задавальненне, з другога ж, на доўгі час абумоўлівае такую моцную залежнасць, што наркаман гатовы плаціць ЛЮБУЮ цану, каб толькі з пэўнасцю атрымаць наркотык.

Аналагічна можна ахарактарызаваць і агульны стан грамадства, у якім пашырана разуменне страчаной здольнасці да будучыні ў выніку паскоранага пераспажывання рэсурсаў і якому пры гэтым забараняецца мяняць характар спажывання і стыль жыцця. Прагрэс у эмфатычным сэнсе, менавіта са станоўчымі перспектывамі выжывання, можа цяпер заключацца ўжо толькі ў мерапрымствах па вяртанні здольнасці чалавецтва да выжывання – напрыклад, у рэзкім скарачэнні мабільнасці. Гэта можа здацца дзіўнай ідэяй менавіта ў час, калі ў Індыі з вулічнага жыцця знікаюць рыкшы, а ў Кітаі веласіпедысты, калі штогод адзначаюцца вялізныя паказчыкі прыросту глабальных таварных патокаў.

Але на самай справе магчымасць скарыстацца любым таварам у любы час і ў любым месцы не з'яўляецца правам чалавека і не сведчыць пра яго здольнасць да будучыні. Гэтая здольнасць заключаецца ў садзейнічанні такім дасягненням цывілізацыі, як перамога над голадам, забеспячэнне адукацыі і аховы здароўя, прававы характар дзяржаўнай пабудовы, дэмакратыя, і такім чынам – ў радыкальным змяншэнні стратнага карыстання прыродай. А што, калі падумаць пра культуру прыпынення мабільнасці? Для гэтага спатрэбіліся б усяго толькі чатыры простыя стратэгіі: прыпыніцца, перастаць, адысці назад, прыйсці ў месца прызначэння.

### а) Прыпыніцца

"Прыпыніцца" – гэта стратэгія набыцця арыентацыі. Часта бывае лепш адтэрмінаваць якія-небудзь дзеянні, чым неадкладна ажыццяўляць іх – напрыклад, тады, калі яшчэ няма дастатковай інфармацыі пра пажаданы вынік дзеянняў. Прыпыніцца – гэта азначае тое ж самае, што і задумацца. Напачатку імпульсам да таго, каб задумацца, можа паслужыць парадаксальнае ўмяшанне плаката: калі "Эканамічны рэгіён: Германія" (1996 г.; малюнак на с. 43) абазначыць аленем, які рыкае на фоне высакавольтнай лініі, то састаўныя часткі існасці індустрыяльнага грамадства складуцца з такіх жа несумяшчальных кавалачкаў мазаікі, як і ў

рэчаіснасці, і тады спачатку нічога больш і прыдумаць не зможаш. Гэта тое імгненне збянтэжанасці, якое адкрывае магчымасць падумаць пра значныя ў грамадскім сэнсе рэчы інакш, чым мы гэта робім звычайна, у модусе рэфлекторнага "мне заўсёды добра вядома, які адказ будзе слушны".

### б) Перастаць

"Перастаць" як стратэгія мараторыя магла б мець тую перавагу, што яна паўстае з фатальнай логікі непасрэднага паслядоўнага шэрагу "праблема – рашэнне – праблема – рашэнне" і дае вольнае месца для назірання збоку – пра якую праблему і ў якім кантэксце гаворка. Перш чым у кантэксце фінансавага крызісу марыць пра тое, што эканоміка ўмомант "запрацуе", варта з дапамогаю стратэгій мараторыя ўсвядоміць, што такі крызіс ёсць шанс убачыць у памяншэнні тэмпаў росту або ў яго адмоўных паказчыках адпраўны момант для неабходнай трансфармацыі: "Выходзь на адкрыты прастор, дружа" (1991 г.; малюнак на с. 49).

### в) Зрабіць крок назад

Любое ўяўленне пра паварот развіццця назад, у накірунку на 180 градусаў, пра разборку ўжо зробленага, вяртанне ў стан, які папярэднічаў статусу кво, абсалютна немагчымае для сучаснасці і для звязанага

з ёю ўсеабдымнага свету прагрэса. У культуры, якая бачыць стрыжань свайго існавання ў дасягненні колькаснага пашырэння, зварот і аналіз ўжо зробленага разглядаюцца як адыход назад ад ужо дасягнутага – нават тады, калі дасягнутае ў выніку разбурэння рэсурсаў разбурае і ўласнае існаванне. Запаволіць рух або зусім не рухацца, застацца дома, развіваць такія формы грамадскіх зносін, для якіх не патрабуецца пераадоленне адлегласцей, – гэта, у супрацьлегласць такому стану, – новыя патрабаванні. Але выкананне такіх патрабаванняў дае вялізны выйгрыш часу і суправаджаецца значным змяншэннем выдаткаў на мабільнасць. Выкарыстоўваючы ў плакаце "Кансультацыі для тых, хто трапіў у корак" (1991 г.; малюнак на с. 33) дзеля рэкламы дванаццаціцыліндравага BMW той аргумент, што гэтая мадэль асабліва апраўдвае сябе ў корках, Штэк паказвае тое, што з такой цяжкасцю спрабуюць растлумачыць даследчыкі мабільнасці: рух, які забяспечваюць 450 конскіх сіл, часта ажыццяўляецца ўсяго толькі з хуткасцю пешай хады. З гэткім поспехам можна адразу абвясціць гэты аўтамабіль скульптурай і тым самым пазбавіць сябе і машыну ад няспраўджанага спадзявання, што яна прынясе задавальненне, даўшы магчымасць хутка даехаць да мэты. Зрабіць крок назад азначае ператварыць аднойчы дасягнутую функцыю ў элемент дэкору. Так, прыгажосць аўтамабіля можна бачыць і без жадання паехаць на ім.

## г) Прыйсці ў месца прызначэння

"Прыйсці ў месца прызначэння" азначае: перастаць аддаваць перавагу дарозе перад мэтай. Па сутнасці гэта ўяўленне пра тое, чаму трэба спрыяць, і адначасова палітычная праграма XXI стагоддзя. Гераічная праграма – таму што, як ужо гаварылася, задача заключаецца ў замацаванні дасягнутых стандартаў цывілізацыі ў такіх сферах як свабода, сацыяльнае забеспячэнне, ахова здароўя, адукацыя, прынцыпы прававой дзяржавы, прытым замацаванні іх у рамках устойлівага ладу эканомікі і ладу жыцця. Гэта яшчэ не вырашаная задача, больш таго – на шляху да яе вырашэння пакуль што не зроблена ніводнага кроку.

**1** Donella Meadows, Jörgen Randers & Dennis Meadows: „Grenzen des Wachstums. Das 30-Jahre-Update" ["Межы росту"]. Stuttgart 2007.

**2** "The Age of Stupid", дакументальная драма брытанскага рэжысёра Фрэні Армстронг, 2009 г.

**Гаральд Вельцэр** (нарадзіўся ў 1958 г.) – сацыёлаг і спецыяліст у галіне сацыяльнай псіхалогіі, дырэктар Цэнтра міждысцыплінарных даследаванняў памяці, г. Эсэн, прафесар узору і перадачы пераўтварэнняў і выканаўчы старшыня фонду "Папярэдні будучы час". Галоўныя тэмы яго даследаванняў і лекцый – памяць, групавое прымяненне сілы, наступствы змянення клімату ў культуралагічным аспекце. Публікацыі (прыкладны спіс): „Klimakriege. Wofür im 21. Jahrhundert getötet wird. Frankfurt/Main; Fischer 2008 (Кліматычныя войны: За што забіваюць у XXI стагоддзі); „Perspektiven einer nachhaltigen Entwicklung: Wie sieht die Welt von morgen aus?". Hrsg. mit Klaus Wiegandt. Frankfurt/Main; Fischer 2011 (Перспектывы ўстойлівага развіцця: як будзе выглядаць заўтрашні свет?). Кнігі Гаральда Вельцэра перакладзены на 15 моў.

Новы ўраджай.
1986

мал. на с. 82–83

Да 225-й гадавіны з дня нараджэння Гётэ.
1974

(111-я ГАДАВІНА З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ ХІМІЧНАЙ КАМПАНІІ "ХЁХСІ")


Neue Ernte




225
JAHRE
GOETHE
111
JAHRE FARBWERKE
HOECHST

Зямля ўнізе.
1995

(ЯКАЯ НАМ СПРАВА ДА МАЛЬДЗІВАЎ?
ТАДЫ МЫ ПРОСТА ЗНОЎ БУДЗЕМ
ЕЗДЗІЦЬ У ІСПАНІЮ)


Was gehen uns die Malediven an?
Dann fahren wir eben wieder nach Spanien.

Такой жменьцы смецця.
1985

(ТАКОЙ ЖМЕНЬЦЫ СМЕЦЦЯ
МЫ ЗДОЛЕЕМ ДАЦЬ РАДЫ)

мал. на с. 88–89

Скарга нябёсам.
1974

# Mit dem bißchen Müll werden wir schon fertig







# Vorsicht! T



inkwasser.



мал. на с. 90–91

Асцярожна! Пітная вада!
1984

Дары прыроды Германіі.
1972

(ДАРЫ ПРЫРОДЫ ГЕРМАНІІ
ДЛЯ ВАШАГА СТАЛА)


Aus deutschen Landen
frisch auf den Tisch

ХЁХСТ* – катастрафічна.
1989

(МЫ РАСТОПІМ ПОЛЮСЫ
надпіс на каструлі: ХЁХСТ – катастрафічна
Усе гавораць пра клімат – а мы яму шкодзім, і на гэтым добра зарабляем: вытворчасцю 140.000 тон хлорыстага і фторыстага вадароду ў год.
Кампаніі КАЛІ і ХЁХСТ, абойцы клімату)

* Гульня слоў: назва камапаніі Хёхст супадае па гучанні з прыметнікам höchst (найвышэйшы), г. зн. надпіс на плакаце чытаецца і наступным чынам: у найвышэшай ступені катастрафічна


WIR BRINGEN DIE
POLE ZUM SCHMELZEN
AFRICA
HOECHST
KATASTROPHAL
lle reden vom Klima – wir machen es kaputt und verdienen
ut daran: durch die Herstellung von 140 000 t FCKW pro Jahr
KALI und HOECHST, die Klimakiller

Першы падарунак: першая атрута.
1989


Das erste Gift

Наступны, калі ласка.
1988

(ЦЮЛЕНІ ВЫМЕРЛІ. НАСТУПНЫ, КАЛІ ЛАСКА!
У трупах цюленяў было знойдзена больш за 1000 пабочных рэчываў: ртуць (у печані -да 40 мг/кг жывой вагі), поліхларыраваныя біфенілы (да 100 мг/кг), DDT, DDE, гексахлорцыклагексан, гама-HCH (ліндан), альфа-MCH тэтрахларыдбензадыаксін-2, 3, 7, 8, а ў мацярынскім малаку да 1 мг поліхларываных біфенілаў на кг, а таксама свінец ............................ )


Die Robben sind tot
Der nächste bitte!
n den toten Robben wurden übar 1000 Fremdstoffe gefunden, darunter
Quecksilber (in der Leber bis zu 40 mg/kg Frischgewicht), PCB 153 (bis zu
00 mg/kg), DDT, DDE, HCH-Isomeren, Gamma-HCH (Lindan), Alpha-HCH,
2, 3, 7, 8 – Tetrachlordibenzodioxin, in der Muttermilch bis zu 1 mg
Polychlorierte Biphenyle je kg, Blei ..............................

Нафтавая пошасць.
1978

(ТЫДЗЕНЬ РЭКЛАМЫ КА[illegible] SHELL
Жыхары ўзбярэжжа могу[illegible]
падключаць сістэмы ацяплення
непасрэдна да мора)


AMOCO
Shell Werbewochen
Die Küstenbewohner können ihre Ölheizung jetzt direkt ans Meer anschließen

Нафтавы шэйх.
1982


Der Ölprinz

Калі падумаеш...
1992

(КАЛІ ПАДУМАЕШ,
ШТО ЧАЛАВЕК НА 70 %
СКЛАДАЕЦЦА З ВАДЫ...)

мал. на с. 106-107

Назад да прыроды.
1985


Wenn man bedenkt
daß der Mensch zu 70 %
aus Wasser besteht . . .


Coca-Cola
Coke
Coca-Cola
Coke
Coke
Coca-Cola
Coke
Coca-Cola
Coke
Coca-Cola


KUHL-
TASCHE


TEILZEITV



RGIFTUNG

мал. на с. 108–109

Пагадзіннае атручванне.
1995

Склад сыравіны.
1984




# ROHSTOFFLAGER

Права першачарговага праезду
для веласіпеда.
1985


Vorfahrt
fürs Fahrrad

Танныя палёты.
2007

(500.000 месцаў для сядзення па нулявым тарыфе!
Аплачваюцца толькі падаткі і аэрапортавы збор.
УСЕ ГАВОРАЦЬ ПРА КЛІМАТ, МЫ РАЗБУРАЕМ ЯГО!
Аб'яднанне танных авіяперавозак, зарэгістраваная
кампанія)


500.000 SITZPLÄTZE ZUM
NULLTARIF!
NUR STEUERN UND FLUGHAFENGEBÜHREN SIND ZU BEZAHLEN - €14,26 EINFACHER FLUG
ALGHERO
GLASGOW
(Prestwick)
GÖTEBORG
(City)
KERRY
KRAKAU
LONDON
(Stansted)
PISA
(Florenz)
RIGA
SANTANDER
SANTIAGO DE COMPOSTELA
SHANNON
STOCKHOLM
(Skavsta)
TRIEST
(Das Tor zu Kroatien)
VALENCIA
VERONA
VENEDIG
(Treviso)
GÜLTIGE REISETAGE MO-SO
ALLE REDEN VOM KLIMA
WIR ZERSTÖREN ES !
Vereinigung der Billigflieger e.V.

Гэта – людзі.
1998

(ГЭТА – ЛЮДЗІ, АД ЯКІХ [illegible]КАЕМ,
ШТО ЯНЫ АПЛАЦЯЦЬ НА[illegible] ДАЎГІ)

# DAS SIND DIE LEUTE, VON DENEN ERWARTET WIRD, DASS SIE UNSERE SCHULDEN BEZAHLEN



# КЛАЎС ШТЭК
# БІЯГРАФІЯ
# УЗНАГАРОДЫ І ІНШЫЯ
# ЎГАНАРАВАННІ

## БІЯГРАФІЯ

| | |
|---|---|
| 1938 | нарадзіўся 28 лютага ў Пульсніцы пад Дрэздэнам |
| 1939–56 | дзіцячыя гады і юнацтва ў прамысловым цэнтры Бітэрфельд (ГДР) |
| 1956 | пераезд у Гейдэльберг (Заходняя Германія) |
| 1957–62 | вывучэнне права ва ўніверсітэтах Гейдэльберга, Гамбурга і Берліна; здача экзамена на рэферэндара |
| 1960 | першыя паштоўкі, плакаты і лістоўкі; 1 красавіка ўступіў у Сацыял-дэмакратычную партыю Германіі |
| 1964 | першыя гравюры на дрэве (да 1967 г.) |
| 1965 | заснаванне выдавецтва Edition Tangente (сёння: "Выдавецтва Штэка") |
| 1968 | першая сумесная праца з Ёзэфам Бойсам |
| 1969 | здача экзамена на асэсара ў Штутгарцкім універсітэце; атрыманне ліцэнзіі адваката |
| 1970 | удзел у заснаванні Міжнароднага мастацка-нфармацыйнага кірмашу (сёння: *Art Cologne*); пачатак супрацоўніцтва з Герхардам Штайдлем |
| 1971 | першая акцыя з плакатамі ў рамках Года Дзюрэра ў Нюрнбергу |
| 1972 | у ходзе перадвыбарнай барацьбы ў Бундэстаг стварае каля мільёна плакатаў, паштовак і наклеек; упершыню уцягваецца ў судовыя працэсы |

1973 становіцца старшынёй заснаванага разам з Ёзэфам Бойсам аб'яднання "Свабодная вышэйшая школа творчасці і міждысцыплінарных даследаванняў"

1974 скандал з нагоды выставы ў лонданскім Інстытуце сучаснага мастацтва

1976 30 сакавіка дэпутаты ад ХДС/ХСС падчас штурму экспанатаў выставы ў Боне зрываюць са сцен плакаты Штэка

1977 удзел у выставе *documenta 6* у Каселі; уступленне ў Саюз нямецкіх пісьменнікаў

1979 заснаванне грамадзянскай ініцыятывы "Акцыя за пашырэнне дэмакратыі"

1982 уступленне ў ПЭН-Цэнтр; удзел у выставе *documenta 7* у Каселі

з 1986 запрошаны прафесар Акадэміі мастацтваў у Дзюсельдорфе

1987 удзел у выставе *documenta 8* у Каселі

1990 абіраецца акадэмікам Акадэміі мастацтваў, Берлін-Брандэнбург

1992 арганізатар Трэцяй Бітэрфельдскай канферэнцыі разам з Ойгенам Блумэ і Хрыстафам Танэртам

1994 праект "Пакажам сцяг"

1998 разам з Джэкам Лангам арганізуе ў Берліне "ЕўраВІЗІІ"

з 2006 прэзідэнт Берлінскай Акадэміі мастацтваў



## Узнагароды і іншыя ўганараванні

1970 Першая прэмія імя Цыле за грамадска-крытычную графіку
1979 прыз Саюза нямецкіх крытыкаў;
залаты медаль Чацвёртай
біенале фотамантажу ў Польшчы
1981 Першы прыз міжнароднай біенале
плакатаў у Лахці (Фінляндыя)
1986 прэмія Трэцяй трыенале еўрапейскага
палітычнага плаката ў Монсе (Бельгія);
ганаровы медаль 11-й біенале графікі ў
Кракаве (Польшча)
1989 прэмія імя Людвіга Тома
1996 грамадзянская прэмія
імя Густава Гайнэмана
1999 "Культурны грош"
Германскай рады культуры
2007 Вялікі Кавалерскі крыж ордэна
"За заслугі перад ФРГ"
2008 мастацкая прэмія "З *вядомай* нагоды"
2010 Зорка сатыры – *Walk of Fame* кабарэ

41 раз рабіліся спробы ўзаконена забараніць плакаты і паштоўкі Штэка.
Творы Клаўса Штэка былі паказаны на больш чым 3000 індывідуальных выстаў у Германіі і за яе межамі.



## ВЫХАДНЫЯ ЗВЕСТКІ

**Herausgeber**
Goethe-Institut e.V., München

**Verantwortlich**
Leonhard Emmerling,
Goethe-Institut München,
Bereichsleiter Bildende Kunst

**Texte**
Leonhard Emmerling
Christoph Tannert
Harald Welzer

**Gestaltung**
KOPFSPRUNG
Frank Georgy, Köln

**Covermotiv/Zwischenseiten**
Klaus Staeck

**Plakatabbildungen**
Alle Bildrechte für die in diesem Buch abgebildeten Plakate liegen bei Klaus Staeck.

**Foto Klaus Staeck**
Manfred Mayer

**Lektorat Katalog, Ausstellungs- und Tourneeorganisation**
Anita Eylmann,
Jeannette Neustadt,
Goethe-Institut e.V., Bereich
Bildende Kunst, München



© 2011 Goethe-Institut e.V.,
Autoren und Künstler

© Скакун Г.А., пераклад на беларускую мову, 2012

© Выданне на беларускай мове,
Інстытут імя Гётэ у Мінску, 2012


GOETHE
INSTITUT

Sprache. Kultur. Deutschland.




GOETHE
INSTITUT
Sprache. Kultur. Deutschland.



GOETHE
INSTITUT
Sprache. Kultur. Deutschland.

КЛАЎС ШТЭК: НІЧОГА НЕ ВЫРАШАНА.